Болбас, В. С. Некаторыя асаблівасці педагагічнай думкі ўсходніх славян / В. С. Болбас // Славянские народы и их культура в современном мире : материалы международной научной конференции / Общество Кирилла Туровского, Белорусский государственный университет транспорта, Мозырский государственный педагогический институт, Гомельский областной общественно-культурный центр ; редколлегия : Коваль В. И. (ответственный редактор) [и др.]. – Гомель, 1996. – С. 72–73.

# НЕКАТОРЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ПЕДАГАГІЧНАЙ ДУМКІ ЎСХОДНІХ СЛАВЯН

**В.С. Болбас**

Адной з істотных праяў агульнасці славянскіх народаў з'яўляецца істотнае падабенства ў вітальных і ментальных прызнаках, якія вызначальна адрозніваюць іх ад іншых супольнасцен свету. Асабліва выразная гісторыка-гентычная роднасць у арганізацыі духоўнага жыцця лічыць усходніх славян. І мабыць нідзе не праяўляецца яна так яўна як у выхаванні падрастаючых пакаленняў.

Узаемасувязі і ўзаемаўплыў ўсходнеславянскіх народаў на працягу іх гісторыі выпрацавалі шмат агульнага ў мэтах, задачах, змесце, прынцыпах, метадах і сродках выхавання. Вывучэнне гэтага матэрыялу сѐння мае не толькі навукова-пазнавальны інтарэс, а можа з поспехам выкарыстоўвацца і сучаснымі арганізагарамі выхаваўчых працэсаў.

Практыка даследвання гэтага пытання дае падставы сцвярджаць, што выхаванне дзяцей ва ўсходніх славян было найпярвейшай і самай галоўнай справай іх жыцця. Захаваўшыяся да нашых дзѐн легенды і паданні паказваюць, што клопат аб дзецях і іншымі продкамі, у адрозненне ад іншых народаў, нават выцясняў на другі план павагу аб старасці.

Усходнія славяне ў справе фарміравання асобы надавалі ўвагу самым разнастайным фактарам: ад асіралагічных да ўплыву навакольнага асяроддзя, але ўсѐ ж вызначальным лічылі спецыяльца арганізаванае выхаваўчае ўздзеянне. Вельмі выразна сфармуляваў такія ідэі прадстаўнік рэфармацыйнай думкі XVI ст., беларуска-польскі асветнік Сымон Будны, які сцвярджаў, што людскія заганы існуюць не ад прыроды, а як вынік дрэннага выхавання.

Галоўнай выхаваўчай мэтай нашы продкі ва ўсе часы лічылі фарміраванне высокамаральнай, дабрачыннай асобы. Такая скіраванасць яскрава прасочваецца яшчэ ў перыяд язычніцтва. Не выпадкова, што хрысціянства, як рэлігійна-маральная школа чалавецтва, знайшло тут спрыяльную глебу, ўводзілася не гвалтоўным шляхам.

Хрысціянская ідэалогія, якая несла славянам навуку, культуру, асаблівы поспех мела ў этыка-рэлігійных накірунках. Як сцвярджаў наш знакаміты супляменнік Кірыла Тураўскі для чалавека нічога не можа быць

вышэй, чым духоўная прыгажосць. Згэтага пункту гледжання ўспрымаліся практычна ўсе праявы жыцця людской супольнасці.

Помнікі пісьменства ўсходніх славян сведчаць аб тым, што пераважная большасць кніг сярэднявечча мела яўна выражаны маральна-духоўны накірунак. Даследчыкі адзначаюць, што нават сугуба прыродазнаўчыя кнігі напаўняюцца ўсходнімі славянамі глыбокім этычным зместам. Адукаванасць высока цанілася нашымі продкамі, але ж лічылася, што "розум без дабрыні – гэта меч у руках вар'ята".

Нават эпоха Адраджэння, якая суправаджалася ў краінах Заходняй і Цэнтральнай Еўропы небывалым узлётам ідэй індывідуалізму, ва ўсходніх славян не парушыла скіраванасць грамадска-педагагічнай думкі да супольнасці, абшчыннасці, калектывізму. Згодна рэнесансавай інтэнцыі тут яна таксама абазначыла арыенціры ўласнага шчасця, уласнай дасканаласці асобы, але ж абавязкова ў рэчышчы імкнення да агульнага дабра.

Наогул ідэі заходнееўрапейскіх гуманістаў мелі даволі вузкую сацыяльную базу. Абвешчаны імі культ чалавека распаўсюджваўся ў асноўным на прадстаўнікоў вышэйшых слаёў грамадства. На ўсходнеславянскіх жа землях гуманістычная плынь з-за больш цеснай яе сувязі з рэлігіяй насіла адметна-дэмакратычны характар, а ідэі гуманістычнай педагогікі, якія з'явіліся на гэтай глебе, мелі ярка выражаную агульначалавечую накіраванасць.

Ва ўсходнеславянскай педагагічнай думцы, дзе такое прыярытэтнае месца адводзілася фарміраванню высокай духоўнасці не зусім прыязна адносіліся да непамерных імкненняў чалавека да матэрыяльных даброт. І зусім катэгарычна асуджалася існаванне адных людзей за кошт іншых. "Сребролюбие" лічылася надзвычай пажыўнай глебай для развіцця многіх чалавечых заган.

Не менш выразнай і характэрнай асаблівасцю выхаваўчых ідэй ўсходнеславянскай педагагічнай думкі з'яўляецца накірунак прывіцця любві да Радзімы. Патрыятычныя памкненні прысутнічаюць у поглядах любога народа, але, мабыць, ні ў каго як ва ўсходніх славян яны не набываюць такой устойлівасці і глыбіні, па якіх вымяраецца ўвесь сэнс жыцця чалавека. Прычым патрыятызм разумеецца не як абстрактая маральная якасць, а разглядаецца як актыўна-дзейсны бок жыцця індывіда.

Вывучэнне і выкарыстанне ў сучасным выхаваўчым працэсе адзначаных і іншых адметнасцей педагагічнай думкі ўсходніх славян будзе садзейнічаць значнаму павышэнню эфектыўнасці фарміравання духоўнага свету падрастаючых пакаленняў, збліжэнню і плённаму супрацоўніцтву славянскіх народаў, што павінна даць добры вынік у росквіце сусветнай агульначалавечай культуры.